ISBN 978-985-565-023-3

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адукацыйныя стандарты

# ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

Выданне афіцыйнае

Мінск
2013

УДК 373.2(476)(083.74)

Дадзены тэхнічны нарматыўны прававы акт Рэспублікі Беларусь не можа быць тыражыраваны і распаўсюджаны без дазволу Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Выдадзены на беларускай мове

ISBN 978-985-565-023-3

## ЗМЕСТ

1. Сфера прымянення . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1
2. Тэрміны і азначэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2
3. Агульныя палажэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
3.1. Задачы адукацыйных стандартаў. . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
3.2. Структура адукацыйных стандартаў . . . . . . . . . . . . . . . 5
4. Мэта і задачы дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . . . . . . . . 5
5. Патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі . . 6
5.1. Агульныя патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
5.2. Патрабаванні да распрацоўкі тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
5.3. Структура тыпавога вучэбнага плана . . . . . . . . . . . . . . . . 8
5.4. Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу . . . . 9
5.5. Патрабаванні да тэрмінаў атрымання дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
5.6. Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выхаванцаў. . . . . 14
Фізічнае развіццё выхаванца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Сацыяльна-маральнае і асобаснае развіццё выхаванца . . . . 15
Пазнавальнае развіццё выхаванца . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Маўленчае развіццё выхаванца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Эстэтычнае развіццё выхаванца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
5.7. Патрабаванні да якасці дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . 23
6. Патрабаванні да арганізацыі выхаваўчай работы . . . . . . . . . . 27
7. Патрабаванні да рэсурснага забеспячэння адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі . . . . . . . . . . . . . . . . 27
7.1. Патрабаванні да кадравага забеспячэння . . . . . . . . . . . . 27
7.2. Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

Зацверджаныя і ўведзеныя
ў дзеянне пастановай
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
ад 29 снежня 2012 г. № 146

# Образовательные стандарты ДОШКОЛЬНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ

# Адукацыйныя стандарты ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

Educational Standards
PRESCHOOL EDUCATION

## 1. Сфера прымянення

Дадзеныя адукацыйныя стандарты дашкольнай адукацыі (далей — адукацыйныя стандарты) вызначаюць патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, тэрмінаў атрымання адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, узроўню падрыхтоўкі выхаванцаў.

Адукацыйныя стандарты дашкольнай адукацыі абавязковыя для прымянення:

- рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання;
- мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;
- установамі адукацыі, іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі пры рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі (далей — дашкольныя ўстановы);
- установамі вышэйшай адукацыі і ўстановамі дадатковай адукацыі дарослых, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку педагагічных работнікаў для сістэмы дашкольнай адукацыі;
- навукова-метадычнымі ўстановамі, якія ўдзельнічаюць у распрацоўцы вучэбных праграм і вучэбных планаў дашкольнай адукацыі.

Адукацыйныя стандарты прымяняюцца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

## 2. Тэрміны і азначэнні

У дадзеных адукацыйных стандартах выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі.

Базавы кампанент — абавязковы змест дашкольнай адукацыі, які суадносіцца з мэтай дашкольнай адукацыі і адлюстроўвае сутнасць напрамкаў развіцця выхаванцаў і змест адпаведных ім адукацыйных сфер.

Выхаванне — мэтанакіраваны працэс фарміравання духоўна-маральнай і эмацыянальна-каштоўнаснай сферы асобы выхаванцаў.

Выхаванец — асоба, якая засвойвае змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Дашкольны ўзрост — этап фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага развіцця асобы дзіцяці ад трох гадоў да яго прыёму ва ўстанову адукацыі для атрымання агульнай сярэдняй або спецыяльнай адукацыі.

Дашкольная адукацыя — узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на рознабаковае развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту ў адпаведнасці з яго узроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі, фарміраванне ў яго маральных нормаў, набыццё ім сацыяльнага вопыту.

Індывідуальны вучэбны план вызначае асаблівасці атрымання дашкольнай адукацыі выхаванцамі з улікам іх магчымасцей, здольнасцей і патрэб, а таксама выхаванцамі, час знаходжання якіх у дашкольнай установе зменшаны па жаданні іх законных прадстаўнікоў.

Якасць дашкольнай адукацыі — адпаведнасць адукацыі патрабаванням адукацыйных стандартаў дашкольнай адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай (спецыяльнай) адукацыі.

Адукацыйныя стандарты дашкольнай адукацыі — тэхнічны нарматыўны прававы акт, які вызначае змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі праз вызначэнне патрабаванняў да адукацыйнага працэсу і вынікаў засваення яе зместу.

Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі — сукупнасць дакументацыі, якая рэгламентуе адукацыйны працэс, і ўмоў, неабходных для атрымання дашкольнай адукацыі ў адпаведнасці з чаканымі вынікамі.

Навучанне на ўзроўні дашкольнай адукацыі — мэтанакіраваны працэс арганізацыі і стымулявання дзейнасці выхаванцаў па засваенні зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі з мэтай іх развіцця ў адпаведнасці з індывідуальнымі і ўзроставымі здольнасцямі.

Адукацыйны працэс — выхаванне і навучанне, арганізаваныя дашкольнай установай з мэтай засваення выхаванцамі зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Педагагічная дыягностыка — выяўленне дынамікі развіцця, паспяховасці выхавання і навучання выхаванцаў з выкарыстаннем методык, рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Развіццё — мэтанакіраванае фарміраванне значных для соцыуму ведаў, уменняў і навыкаў, выхаванне станоўчых рыс асобы.

Ранні ўзрост — пачатковы этап фізічнага, псіхічнага і сацыяльнага развіцця асобы дзіцяці ад двух месяцаў да трох гадоў.

Сістэма дашкольнай адукацыі — сукупнасць кампанентаў, якія ўзаемадзейнічаюць і накіраваны на дасягненне мэт адукацыі.

Кампаненты сістэмы дашкольнай адукацыі:

- удзельнікі адукацыйнага працэсу (выхаванцы, іх законныя прадстаўнікі, педагагічныя работнікі);
- адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі;
- дашкольныя ўстановы;
- дзяржаўныя арганізацыі адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы дашкольнай адукацыі;
- рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання;

• іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь;

• мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя арганізацыі і фізічныя асобы ў межах іх паўнамоцтваў у сферы дашкольнай адукацыі.

Змест дашкольнай адукацыі — педагагічна адаптаваная і навукова абгрунтаваная сістэма ўяўленняў, уменняў, навыкаў, вопыту творчай дзейнасці, эмацыянальна-каштоўнасных адносін дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту да сябе і свету. Забяспечвае паўнату і цэласнасць развіцця выхаванца. Уключае ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя напрамкі развіцця: фізічнае, сацыяльна-маральнае і асобаснае, пазнавальнае, маўленчае, эстэтычнае. Змест кожнага напрамку канкрэтызуецца асобнымі дыдактычным адзінкамі зместу — адукацыйнымі сферамі: фізічная культура, дзіця і грамадства, элементарныя матэматычныя ўяўленні, дзіця і прырода, развіццё маўлення і культура маўленчых зносін, навучанне грамаце, мастацтва.

Змест дашкольнай адукацыі звыш базавага кампанента вызначаецца заканамернасцямі развіцця дзяцей у дашкольным узросце, садзейнічае пашырэнню і раскрыццю магчымасцей, задавальненню індывідуальных патрэб кожнага выхаванца з улікам зоны яго бліжэйшага развіцця ва ўмовах розных відаў дзейнасці. Змест дашкольнага працэсу звыш базавага кампанента не дублірує змест базавага кампанента.

Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі — тэхнічны нарматыўны прававы акт, які ўстанаўлівае пералік адукацыйных сфер, колькасць вучэбных гадзін на іх вывучэнне па групах выхаванцаў, максімальную дапушчальную вучэбную нагрузку і агульную колькасць вучэбных гадзін на тыдзень.

Вучэбны план дашкольнай установы — вучэбна-праграмная дакументацыя, якая распрацоўваецца дашкольнай установай на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі, вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі і зацвярджаецца кіраўніком дашкольнай установы.

Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі — тэхнічны нарматыўны прававы акт, які вызначае мэты і задачы вывучэння адукацыйных сфер, іх змест, час, адведзены на вывучэнне пэўных тэм, віды дзейнасці, рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання.

Эксперыментальны вучэбны план дашкольнай установы — план, які апрабуецца ў дашкольнай установе, на базе якой ажыццяўляецца эксперыментальная дзейнасць.

## 3. Агульныя пцалажэнні

### 3.1. Задачы адукацыйных стандартаў

Адукацыйныя стандарты заклiканы забяспечыць:

- аптымальную ступень упарадкавання структуры, зместу дашкольнай адукацыі, яе вынікаў, аб'ёму аптымальнай вучэбнай нагрузкі для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту;
- пераемнасць у змесце дашкольнай адукацыі і першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- рэгуляванне ўзаемаадносін удзельнікаў адукацыйнага працэсу ў дасягненні мэт дашкольнай адукацыі, павышэнні яе якасці.

### 3.2. Структура адукацыйных стандартаў

Адукацыйныя стандарты раскрываюць сферу іх прымянення, утрымліваюць азначэнні тэрмінаў асноўных аб'ектаў стандартызацыі, агульныя палажэнні, а таксама ўключаюць:

- мэты і задачы дашкольнай адукацыі;
- агульныя патрабаванні:
  - да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі;
  - да арганізацыі адукацыйнага працэсу;
  - да тэрмінаў атрымання адукацыі;
  - да ўзроўню падрыхтоўкі выхаванцаў.

## 4. Мэта і задачы дашкольнай адукацыі

Мэтай дашкольнай адукацыі з'яўляецца рознабаковае развіццё і сацыялізацыя выхаванца ранняга і дашкольнага ўзросту ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі.

Задачы дашкольнай адукацыі:

• ахова і ўмацаванне здароўя дзіцяці, фарміраванне асноў здаровага ладу жыцця;

• фарміраванне ў выхаванцаў гуманных адносін да сябе і навакольнага свету, гуманных узаемаадносін з навакольнымі;

• забеспячэнне рознабаковага развіцця асобы дзіцяці, а таксама стварэнне ўмоў для яго ранняй сацыялізацыі і самаразвіцця;

• далучэнне выхаванцаў да агульначалавечых каштоўнасцей;

• узаемадзеянне з сям'ёй з мэтай паўнавартаснага развіцця дзяцей і павышэння псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў;

• фарміраванне грамадзянскасці і нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў, маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры;

• забеспячэнне пераемнасці паміж дашкольнай адукацыяй і першай ступенню агульнай сярэдняй адукацыі.

## 5. Патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі

### 5.1. Агульныя патрабаванні да зместу вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі

Адукацыйная праграма дашкольнай адукацыі павінна ўключаць змест (адукацыйныя стандарты, навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі) і рэсурснае (кадравае і матэрыяльнатэхнічнае) забеспячэнне.

Для рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі на аснове адукацыйных стандартаў распрацоўваюцца тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі, вучэбная праграма дашкольнай адукацыі.

Дашкольная ўстанова на аснове тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі распрацоўвае вучэбны план дашкольнай установы.

Парадак арганізацыі распрацоўкі і зацвярджэння вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі вызначаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Усе адукацыйныя сферы тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі для рэалізацыі зместу вучэбнай праграмы

мы дашкольнай адукацыі павінны быць забяспечаны вучэбна-метадычнай дакументацыяй, вучэбнымі выданнямі, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі.

У адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца вучэбныя дапаможнікі і іншыя вучэбныя выданні, зацверджаныя або дапушчаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэкамендаваныя арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі.

## 5.2. Патрабаванні да распрацоўкі тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі

5.2.1. Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі распрацоўваецца на аснове дадзеных адукацыйных стандартаў і ўключае:

- пералік адукацыйных сфер;
- колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне адукацыйных сфер па групах выхаванцаў;
- агульную колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) за тыдзень;
- максімальную дапушчальную вучэбную нагрузку за тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах).

5.2.2. Найменне адукацыйных сфер вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь сумесна з арганізацыямі, што ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне дашкольнай адукацыі.

5.2.3. Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка і агульная колькасць вучэбных гадзін за тыдзень вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці заключэння арганізацый і ўстаноў, што ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд, на адпаведнасць санітарна-эпідэміялагічнаму заканадаўству.

5.2.4. Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка вызначаецца шляхам памнажэння агульнай колькасці вучэбных гадзін за тыдзень, адведзеных на вывучэнне адукацыйных сфер у адпаведнасці з узростам выхаванцаў, іх індывідуальнымі асаблівасцямі развіцця, на даўжыню адной вучэбнай гадзіны (заняткаў (гульні)), устаноўленую санітарна-эпідэміялагічным заканадаўствам у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

5.2.5. Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі з'яўляецца асновай для распрацоўкі:

• вучэбнага плана дашкольнай установы з улікам асаблівасцей кантынгента дзяцей установы і рэсурсных умоў (кадравых, матэрыяльна-тэхнічных);

• вучэбных планаў спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі з улікам структуры і ступені цяжкасці фізічных і (ці) псіхічных парушэнняў дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

• вучэбнага плана групы інтэграванага навучання і выхавання на бягучы навучальны год.

## 5.3. Структура тыпавога вучэбнага плана

Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцы 1.

*Табліца 1*

**Структура тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі**

| № | Пералік адукацыйных сфер | Колькасць вучэбных гадзін[1] на вывучэнне адукацыйных сфер па групах выхаванцаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старэйшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старэйшая (ад 6 да 7 гадоў) |
| 1 | Фізічная культура | 1 | 2 | 3 | 4 | 4 | 4 |
| 2 | Дзіця і грамадства | 2 | 2 | 2 | 2 | 1 | 1 |
| 3 | Элементарныя матэматычныя ўяўленні | — | — | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 4 | Дзіця і прырода | — | — | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5 | Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Навучанне грамаце | — | — | — | — | 1 | 1 |
| 7 | Мастацтва | 1 | 4 | 4 | 5 | 5 | 5 |
| | Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) за тыдзень, у тым ліку пры арганізацыі адукацыйных паслуг звыш зместу адукацыйных сфер | 5 | 10 | 12 | 15<br>2* | 15<br>3* | 15<br>3* |
| | Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка за тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах)[2] | 0,4—0,6 | 1,6 | 3 | 5,6 | 7,5 | 9 |

[1]Пад вучэбнымі гадзінамі ва ўстанове дашкольнай адукацыі маецца на ўвазе даўжыня правядзення спецыяльна арганізаваных формаў адукацыйнага працэсу — гульні (заняткаў), адпаведнай узроставым магчымасцям выхаванца згодна з санітарна-эпідэміялагічным заканадаўствам.

[2]Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка вызначаецца шляхам памнажэння агульнай колькасці вучэбных гадзін за тыдзень, адведзеных на вывучэнне адукацыйных сфер па групе выхаванцаў, на даўжыню адной вучэбнай гадзіны (заняткаў) у залежнасці ад узросту выхаванцаў.

*Вучэбныя гадзіны, адведзеныя на рэалізацыю адукацыйных паслуг звыш зместу наступных адукацыйных сфер: развіццё маўлення і культура маўленчых зносін; замежная мова; дзіцячае ручное ткацтва; харэаграфія.

### 5.4. Патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу

5.4.1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца выхаванцы, законныя прадстаўнікі выхаванцаў, педагагічныя работнікі.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ўвесь год. Агульная працягласць канікулаў, у перыяд якіх заняткі з выхаванцамі не праводзяцца, складае 110 дзён: летнія — 90 каляндарных дзён; зімовыя — 10 каляндарных дзён; вясновыя — 10 каляндарных дзён. У перыяд канікулаў праводзіцца фізкультурна-аздараўленчая і мастацка-эстэтычная работа з выхаванцамі.

5.4.2. Адукацыйны працэс арганізуецца ў рэжыме 5-дзённага вучэбнага тыдня. Штодзённая колькасць заняткаў (гульняў) у кожнай узроставай групе і іх паслядоўнасць вызначаюцца вучэбным планам дашкольнай установы.

5.4.3. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь. Асноўная мова навучання і выхавання вызначаецца яго заснавальнікам з улікам пажаданняў законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

5.4.4. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца гульня, заняткі. Акрамя асноўных формаў арганізацыі могуць выкарыстоўвацца іншыя формы: экскурсія, назіранне, гутарка, дзяжурства і інш.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ў групах першага ранняга ўзросту (да 1 года) праводзяцца індывідуальныя гульні ў адпаведнасці з узроставымі і індывідуальнымі патрэбамі выхаванцаў.

5.4.5. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ўключае аптымальнае чаргаванне відаў дзіцячай дзейнасці: спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці выхаванцаў.

Спецыяльна арганізаваная дзейнасць выхаванцаў — гэта рэгламентаваныя тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі гульня, заняткі, арганізаваныя з улікам заканамернасцей іх развіцця ў раннім і дашкольным узросце. У раскладзе дня адмыслова арганізаваная дзейнасць выступае ў якасці спадарожнай іншым відам дзейнасці.

Нерэгламентаваная дзейнасць выхаванцаў — гэта гульня і іншыя віды дзейнасці ў раскладзе дня, якія арганізоўваюцца або ўзнікаюць як з удзелам дарослага, так і пры яго ўскосным кіраўніцтве.

5.4.6. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца ў групах (падгрупах) ці індывідуальна.

Выхаванцы аб'ядноўваюцца ў групы:

*агульнага прызначэння:*

- першага ранняга ўзросту (да 1 года);
- другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў);
- першую малодшую (ад 2 да 3 гадоў);
- другую малодшую (ад 3 да 4 гадоў);
- сярэднюю (ад 4 да 5 гадоў);

- старэйшую (ад 5 да 7 гадоў);
- рознаўзроставую (ад 1 да 7 гадоў);

*санаторныя:*

- першага ранняга ўзросту (да 1 года);
- другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў);
- першую малодшую (ад 2 да 3 гадоў);
- другую малодшую (ад 3 да 4 гадоў);
- сярэднюю (ад 4 да 5 гадоў);
- старэйшую (ад 5 да 7 гадоў);
- рознаўзроставую (ад 1 да 7 гадоў);

*інтэграванага навучання і выхавання*;

*спецыяльныя групы*.

5.4.7. Напаўняльнасць груп не павінна перавышаць:

- першага ранняга ўзросту — 7 выхаванцаў;
- другога ранняга ўзросту — 10 выхаванцаў;
- першай малодшай — 15 выхаванцаў;
- другой малодшай — 20 выхаванцаў;
- сярэдняй — 20 выхаванцаў;
- старэйшай — 20 выхаванцаў;
- рознаўзроставай — 12 выхаванцаў;
- санаторнай першага ранняга ўзросту — 10 выхаванцаў;
- санаторнай другога ранняга ўзросту — 10 выхаванцаў;
- санаторнай першай малодшай — 10 выхаванцаў;
- санаторнай другой малодшай — 15 выхаванцаў;
- санаторнай сярэдняй — 15 выхаванцаў;
- санаторнай старэйшай — 15 выхаванцаў.

Групы інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў і для дзяцей ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў.

Напаўняльнасць груп інтэграванага навучання і выхавання для дзяцей ва ўзросце да трох гадоў складае ад 8 да 10 выхаванцаў, з іх:

- дзіця з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднастайнага характару (дзіця з інтэлектуальнай недастатковасцю (разумовай адсталасцю), або глухое, або невідушчае, або з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю));

• не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднастайнага характару (дзеці са слабым слыхам, або са слабым зрокам, або з цяжкімі парушэннямі маўлення, або з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні));

• не больш за дзве асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

Напаўняльнасць груп інтэграванага навучання і выхавання для дзяцей ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў складае ад 10 да 12 выхаванцаў, з іх:

• не больш за дзве асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднастайнага характару (дзеці з інтэлектуальнай недастатковасцю (разумовай адсталасцю), або глухія, або невідушчыя, або з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю));

• не больш за чатыры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднастайнага характару (дзеці са слабым слыхам, або са слабым зрокам, або з цяжкімі парушэннямі маўлення, або з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні));

• не больш за тры асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш за два) парушэннямі развіцця.

Напаўняльнасць спецыяльных груп складае:

• для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў —12 выхаванцаў;

• для глухіх дзяцей — 6 выхаванцаў;

• для дзяцей са слабым слыхам ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 8 выхаванцаў;

• для невідушчых дзяцей — 6 выхаванцаў;

• для дзяцей са слабым зрокам ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 10 выхаванцаў;

• для дзяцей з амбліопіяй ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 10 выхаванцаў;

• для дзяцей з касавокасцю ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 10 выхаванцаў;

• для слепаглухіх дзяцей — 2 выхаванцы;

• для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні) ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 10 выхаванцаў;

• для дзяцей з раннім дзіцячым аўтызмам — 6 выхаванцаў;

• для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату ва ўзросце да трох гадоў — 6 выхаванцаў, а ва ўзросце ад трох да васьмі гадоў — 8 выхаванцаў;

• для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю) — 3 выхаванцы;

• для дзяцей з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю — 6 выхаванцаў;

• для дзяцей з сярэдняй, цяжкай інтэлектуальнай недастатковасцю — 4 выхаванцы;

• для дзяцей з цяжкімі і (ці) прадстаўленымі ў вялікай колькасці фізічнымі і (ці) псіхічнымі парушэннямі — 4 выхаванцы, а ў выпадку калі ў гэтай групе ёсць адзін выхаванец з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату (са значным і рэзка выяўленым парушэннем перамяшчэння або яго адсутнасцю) — 3 выхаванцы.

Заснавальнік дашкольнай установы адукацыі можа ўстанаўліваць меншую напаўняльнасць груп у парадку, вызначаным заканадаўствам.

5.4.8. Для атрымання інфармацыі аб эфектыўнасці адукацыйнага працэсу ў дашкольнай установе, а таксама аб дынаміцы развіцця, паспяховасці выхавання і навучання гадаванцаў дашкольных устаноў праводзіцца псіхалагічная і педагагічная дыягностыка.

Пры аказанні псіхалагічнай дапамогі выкарыстоўваюцца метады і методыкі псіхалагічнай дыягностыкі, псіхалагічнай карэкцыі, псіхалагічнага кансультавання, псіхалагічнай прафілактыкі, псіхалагічнай асветы, дазволеныя для выкарыстання Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Пры аказанні псіхалагічнай дапамогі педагог-псіхолаг інфармуе законнага прадстаўніка непаўналетняга аб мэтах, формах і метадах аказання псіхалагічнай дапамогі, а таксама аб наяўнасці ў яго права адмовіцца ад прапанаваных метадаў аказання

псіхалагічнай дапамогі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных ч. 2 арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі” (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь. — 2010. — № 170. — 2/1708).

Педагагічная дыягностыка ажыццяўляецца выхавальнікам у цесным супрацоўніцтве з іншымі педагагічнымі работнікамі. На аснове вынікаў дыягностыкі выхавальнікам і педагогампсіхолагам дашкольнай установы складаецца характарыстыка на выхаванца. У ёй пазначаюцца:

- дата запаўнення;
- звесткі пра выхаванца і яго сям’ю: прозвішча, уласнае імя дзіцяці, дата і год нараджэння, узрост на момант абследавання, адрас, прозвішча і ініцыялы законных прадстаўнікоў выхаванца, іх адукацыя, род заняткаў, склад сям’і, матэрыяльныя ўмовы жыцця сям’і (добрыя, здавальняючыя, нездавальняючыя);
- даныя аб гатоўнасці выхаванца да навучання на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі: характарыстыка фізічнага, сацыяльна-маральнага і асобаснага, пазнавальнага, моўнага, эстэтычнага развіцця;
- заключэнне.

Характарыстыка падпісваецца выхавальнікам, педагогампсіхолагам і зацвярджаецца кіраўніком дашкольнай установы.

5.4.9. Планаванне адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца на аснове вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей выхаванцаў.

## 5.5. Патрабаванні да тэрмінаў атрымання дашкольнай адукацыі

Тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі вызначаецца законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў. Пры гэтым тэрмін засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі складае да 5 гадоў 10 месяцаў і можа быць павялічаны на 1 год па медыцынскіх рэкамендацыях або па рашэнні законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

## 5.6. Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выхаванцаў

Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка дашкольнай установы абумоўлены мэтамі, задачамі і зместам дашколь-

най адукацыі і ўключаюць чаканыя вынікі развіцця выхаванца, вызначаныя паказчыкамі выхавання, навучання і развіцця дзіцяці ад 5 да 7 гадоў (далей — паказчыкі).

Паказчыкі ўяўляюць сабой пералік дасягненняў дзіцяці, неабходных для яго далейшага развіцця, і з'яўляюцца абагульненымі сацыяльна значнымі чаканнямі развіцця дзіцяці, нормамі развіцця дзяцей ва ўзросце 5—7 гадоў (узровень адукаванасці), арыенцірамі ў дзейнасці дарослых (педагагічных работнікаў, законных прадстаўнікоў выхаванцаў), накіраванымі на дасягненне пэўнай адукацыйнай мэты.

## ФІЗІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАНЦА

### Адукацыйная сфера: ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА

Добра валодае сваім целам, захоўвае правільную паставу.

Праяўляе асноўныя рухальныя якасці (спрыт, гнуткасць, хуткасць, моц).

Валодае элементамі спартыўных практыкаванняў (катанне на каньках, плаванне і інш.) і спартыўных гульняў (баскетбол, хакей, тэніс і інш.). Гуляе з задавальненнем.

Займаецца фізічнымі практыкаваннямі з задавальненнем.

Праяўляе элементы творчасці пры выкананні фізічных практыкаванняў, гульняў, цікавасць да спаборніцтваў з аднагодкамі ў выкананні фізічных практыкаванняў; умее арганізаваць рухавыя гульні з аднагодкамі.

Валодае элементарнымі навыкамі здаровага ладу жыцця: выконвае правілы асабістай гігіены, праяўляе разумную асцярожнасць у патэнцыяльна небяспечных сітуацыях.

## САЦЫЯЛЬНА-МАРАЛЬНАЕ І АСОБАСНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАНЦА

### Адукацыйная сфера: ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА

Прымае дарослага ў якасці педагога, патрабаванням якога ён давярае. Карыстаецца даверам дарослага, праяўляе самастойнасць у разнастайных сітуацыях. Вітаецца, развітваецца, дзякуе дарослым па ўласнай ініцыятыве або пры напамінку. Дзейнічае па вуснай інструкцыі дарослага. Імкнецца да добразычлівай увагі, павагі, паразумення і суперажывання з боку дарослых,

супрацоўніцтва з імі. Праяўляе пачуццё сімпатыі, эмацыянальнай прыхільнасці, даверу.

Усведамляе сябе ў часе (у сучасным, мінулым і будучым).

Вызначае роднасныя адносіны, праяўляе цікавасць да гісторыі сваёй сям'і.

Вітаецца, развітваецца, дзякуе аднагодкам па ўласнай ініцыятыве або пры напамінку. Імкнецца да паразумення і суперажывання. Адчувае пачуццё сімпатыі, эмацыянальнай прыхільнасці, даверу ў зносінах з аднагодкамі.

Плануе сумесную дзейнасць, улічваючы інтарэсы і меркаванне партнёра. Гібка выкарыстоўвае камунікатыўныя ўменні пры зносінах.

Умее кантактаваць з дарослымі і аднагодкамі, гуляць у розныя гульні. Праяўляе навыкі зносін з дзецьмі рознага ўзросту, увагу да эмацыянальнага стану дзяцей і дарослых. Выказвае гатоўнасць праявіць клопат, спагаду.

Праяўляе спагадлівасць, просіць аб дапамозе і аказвае яе.

Знаёмы з дзяржаўнай сімволікай (сцяг, гімн, герб), з жывёламі, птушкамі, дрэвамі, кветкамі, якія могуць з'яўляцца сімваламі беларускай дзяржавы (хвоя, зубр, бусел, кветка лёну, канюшына, васілёк).

Знаёмы з паняццем “радзіма” (месцам, дзе нарадзіўся чалавек, дзе жывуць яго родныя), ведае славутасці свайго горада (вёскі), сваёй Радзімы.

Знаёмы з этнічнымі прыметамі жыхароў Беларусі, мовай народа, лепшымі якасцямі беларусаў (дабрыня, спагадлівасць і да т. п.).

Мае ўяўленне пра тое, якія цяжкасці ўзнікаюць у жыцці іншых людзей, у тым ліку пажылых (бабуляў і дзядуляў), інвалідаў (дарослых і дзяцей).

Праяўляе самастойнасць у разнастайных жыццёвых сітуацыях.

Выконвае правілы асабістай гігіены, валодае культурна-гігіенічнымі навыкамі (мыецца, прычэсваецца, чысціць зубы, мые рукі пасля туалета і інш.), праяўляе элементарныя навыкі самаабслугоўвання.

Ставіцца станоўча да выканання аздараўленчых мерапрыемстваў (паветраныя, водныя працэдуры і інш.).

Прымае ўдзел ва ўсіх відах дзіцячай дзейнасці. Праяўляе перадумовы вучэбнай дзейнасці (уважліва і дакладна выконвае паслядоўныя ўказанні дарослага, самастойна дзейнічае па

заданні педагога, праяўляе творчую ініцыятыву, гатовы да валявога намагання для пераадолення цяжкасцяў).

## ПАЗНАВАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАНЦА

### Адукацыйныя сферы: ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА, ЭЛЕМЕНТАРНЫЯ МАТЭМАТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ, ДЗІЦЯ І ПРЫРОДА, РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН, МАСТАЦТВА

Дапытлівы. Праяўляе пазнавальную цікавасць да складаных, незнаёмых аб'ектаў. Выкарыстоўвае розныя тыпы пытанняў для атрымання інфармацыі.

Задае пытанні аб прызначэнні прадметаў, прычынах і наступствах з'яў (прыродных, сацыяльных, экалагічных). Групуе, класіфікуе і будуе серыю з 5—10 прадметаў і з'яў па 1—3 прыметах.

Вылучае форму ў аб'ектах (канструкцыях, дэталях будаўнічага матэрыялу), аналізуе форму прадмета, падбірае матэрыял пэўнай формы для стварэння выразнага вобраза.

Адрознівае колеры спектра і адценні, знаёмы з прыёмамі стварэння новых адценняў колеру.

Ставіць перад сабой задачу запомніць. Валодае лагічнымі аперацыямі: аналізуе, вылучае якасці і ўласцівасці, параўноўвае, устанаўлівае адпаведнасць, групуе.

Складае простыя планы-схемы, маршруты, рухаецца па іх. У думках змяняе прасторавае становішча аб'екта, яго частак, ажыццяўляе пераўтварэнне. Выкарыстоўвае ўмоўна-сімвалічныя выявы (графічныя схемы, планы, мадэлі). Усталёўвае найпрасцейшыя прычынна-выніковыя сувязі.

Уяўляе з дапамогай сімвалаў як канкрэтныя, так і абстрактныя прадметы, прагназуе не толькі канчатковы вынік, але і прамежкавыя этапы дзеяння.

Праяўляе адвольную ўвагу. Засяроджаны пры даследаванні новых аб'ектаў, здольны ўтрымліваць увагу пры вырашэнні пастаўленых задач і выкананні творчых заданняў.

Валодае сэнсорнымі эталонамі, перцэптыўнымі дзеяннямі, звязанымі з пазнаннем.

Выконвае прадметна-прыладныя, абследвальніцкія дзеянні, выкарыстоўвае для даследавання прадметаў і з’яў элементарныя вымяральныя прыборы (шалі, павелічальнае шкло і да т. п.) і матэрыялы.

Валодае найпрасцейшымі прыёмамі абагульнення, сістэматызацыі, класіфікацыі.

## Адукацыйная сфера: ЭЛЕМЕНТАРНЫЯ МАТЭМАТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ

Знаходзіць “адзін” і “шмат” сярод прадметаў і з’яў навакольнага свету.

Лічыць прадметы да 10.

Пазнае лічбы ад 0 да 9.

Дзеліць цэлае на 2—8 частак. Разумее, што частка меншая за цэлае, а цэлае большае за частку. Адэкватна ўмовам ужывае словы “частка”, “палова”.

Раскладвае прадметы ў парадку ўзрастання або змяншэння іх даўжыні, таўшчыні, вышыні, велічыні.

Ведае і называе геаметрычныя фігуры.

Вызначае прасторавае становішча аб’ектаў адзін адносна аднаго (справа, злева і інш.).

Вызначае паслядоўнасць частак сутак, дзён тыдня, месяцаў, пораў года.

## Адукацыйная сфера: ДЗІЦЯ І ПРЫРОДА

Мае ўяўленні аб элементарнай будове, функцыях і гігіене органаў пачуццяў (вочы, нос, язык, вушы, скура).

Валодае навыкамі догляду жывёл і раслін, выконвае даручэнні зацікаўлена і добразычліва.

Мае элементарныя ўяўленні аб клімаце, жывёлах (свойскіх і дзікіх), раслінах, сезонных зменах у прыродзе.

Суадносіць наяўнасць тыповых насельнікаў (2—3 жывёлы) і раслін з асаблівасцямі прыродных супольнасцей (лес, луг і г. д.) і асаблівасцямі клімату: у халодных мясцовасцях (зіма доўгая, халодная; лета кароткае, прахалоднае), у спякотных мясцовасцях (зімы няма, спякотнае лета), у сярэдняй паласе (не вельмі халодная зіма і неспякотнае лета).

Вызначае прычынна-выніковыя сувязі: залежнасць паміж сезоннымі зменамі ў нежывой прыродзе і станам раслін і жывёл,

паміж асаблівасцямі знешняга выгляду жывёл, іх паводзінамі і асяроддзем пражывання і інш.

Разумее неабходнасць беражлівага стаўлення да жывой прыроды, энергетычных рэсурсаў.

Мае ўяўленні аб тым, што змена сезонаў залежыць ад Сонца.

Выконвае правілы паводзін у прыродзе.

Праяўляе гуманнае стаўленне да жывой істоты і прыроднай супольнасці; валодае навыкамі рацыянальнага прыродакарыстання (“не смеціць”, “хадзіць у парку па спецыяльных дарожках, а не па газоне” і інш.).

## МАЎЛЕНЧАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАНЦА

### Адукацыйная сфера:
### РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН

Адрознівае абагульняючыя паняцці.

Разумее значэнне мнагазначных слоў розных часцін мовы, мае запас сінонімаў, антонімаў, мнагазначных слоў, ужывае словы, найбольш дакладна прыдатныя да сітуацыі.

Валодае навыкамі элементарнага асэнсавання слова і слоўных адносін.

Разумее і выкарыстоўвае ў маўленні граматычныя сродкі, актыўна шукае правільную форму слова.

Мае ўяўленне аб граматычнай структуры маўлення.

Валодае навыкамі фанематычнага ўспрымання маўлення.

Умее правільна вымаўляць усе гукі беларускай мовы.

Адрознівае свісцячыя, шыпячыя і санорныя гукі, цвёрдыя і мяккія — ізаляваныя, у словах і фразавым маўленні. Дыферэнцыруе пары гукаў *с — з*, *с — ц*, *ш — ж*, *ч — шч*, *л — р*. Падбірае словы і фразы, падобныя па гучанні.

Вызначае правільнае вымаўленне.

Валодае агульнамаўленчымі ўменнямі (маўленчае дыханне, тэмп, рытм маўлення, дыкцыя). Змяняе сілу голасу, тэмп маўлення, інтанацыю ў залежнасці ад зместу выказвання, умоў зносін.

Праяўляе культуру зносін.

Умее самастойна складаць апісальныя і апавядальныя тэксты.

Узнаўляе мастацкі тэкст без дапамогі дарослага, інтанацыйна перадае дыялог дзеючых асоб і характарыстыку персанажаў.

Праяўляе індывідуальныя творчыя здольнасці да маўленчай дзейнасці.

## Адукацыйная сфера: РАЗВИТИЕ РЕЧИ И КУЛЬТУРА РЕЧЕВОГО ОБЩЕНИЯ

Различает белорусскую и русскую речь.

Понимает русскую речь, умеет отвечать на вопросы педагога.

Владеет некоторыми особенностями грамматического строя русской речи: единственное и множественное число отдельных существительных (*крупа*, *дверь*, *фрукты*, *овощи*); согласование прилагательных с некоторыми существительными (*длинная тень*, *белый козленок*, *веселая гармонь*); образование некоторых падежных форм существительных (*берег — на берегу*, *дорога — по дороге*, *по картинкам*, *по лесам*, *с папой*); сравнительной (*выше кого*, *лучше кого*) и превосходной форм прилагательных (*выше всех*, *прекраснейший*); наречий (*утром*, *зимой*).

Владеет специфическими русскими морфолого-синтаксическими оборотами (*болит у кого*, *болеть чем*, *ходить по грибы (ягоды)*, *благодарить кого*, *смеяться над кем* и др.).

Правильно произносит специфически русские звуки: взрывные *г*, *г'*; всегда мягкие *ч*, *щ* — в словах и фразах; безударные гласные, русские и белорусские слова, похожие по звучанию (*звярок — зверек*, *ноч — ночь* и др.).

Пересказывает небольшие литературные произведения на русском языке.

Владеет элементарными навыками общения на русском языке.

Замечает речевые особенности русского языка в сравнении с белорусским.

Составляет самостоятельные высказывания на русском языке.

## Адукацыйная сфера: НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

Падбірае словы з рознай працягласцю гучання, падобныя і не падобныя па гучанні.

Падбірае словы з зададзеным гукам.

Дзеліць двух-, трохскладовыя словы на склады.

Вылучае націскны склад, вызначае месца націску ў структуры слова, якое аналізуецца.

Вымаўляе словы з пастаянным і перанесеным націскам, разумее сэнсаадрознівальную ролю націску.

Мае ўяўленне пра сказ, дзеліць яго на словы, складае сказы з 2—4 слоў без прыназоўнікаў і злучнікаў.

Робіць гукавы аналіз трох-, чатырох-, пяцігукавых слоў рознай гукавой структуры.

Правільна ўжывае ў маўленні тэрміны “сказ”, “слова”, “склад”, “націскны склад”, “гук”, “галосны гук”, “цвёрды зычны гук”, “мяккі зычны гук”.

## ЭСТЭТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАНЦА

### Адукацыйная сфера: МАСТАЦТВА

Успрымае вакальную і інструментальную музыку. Праяўляе эмацыянальны водгук, цікавасць да музыкі розных жанраў. Уяўляе музычны вобраз, яго дзеянні. Слухае твор уважліва да заканчэння гучання. Адрознівае і называе:

- характар музыкі (вясёлы, сумны, пяшчотны, усхваляваны, загадкавы, урачысты, рашучы, важны і інш.);
- сродкі музычнай выразнасці (лад, тэмп і моц гучання);
- жанр музычнага твора (марш, вальс, полька, песня), яго характэрныя асаблівасці;
- галасы выканаўцаў (жаночы, мужчынскі, дзіцячы).

Праяўляе цікавасць да самастойнага музіцыравання на дзіцячых музычных інструментах.

Спявае выразна, працяжна, без напругі, натуральным гукам; эмацыянальна адгукаецца на змест песні; выразна і правільна вымаўляе словы. Называе ўпадабаныя песні, папеўкі і выконвае іх. Праяўляе цікавасць да спеваў дарослых і аднагодкаў. Дзеліцца ўражаннямі аб упадабаных песнях.

Праяўляе цікавасць да музычна-рытмічнай дзейнасці. Успрымае музыку і рухаецца ў адпаведнасці з яе характарам, рытмічна, пластычна, выразна, перадаючы з дапамогай рухаў характэрныя рысы музычнага ладу. Водзіць карагод, гуляе ў музычныя гульні пад інструментальную музыку і спевы, выконвае розныя віды

танцавальных рухаў, крокі, рытмічныя воплескі, скокі і танцы, свабодна арыентуецца ў прасторы. Актыўна ўключаецца ў танцавальную і музычна-гульнявую творчасць.

Успрымае і эмацыянальна рэагуе на творы мастацтва (кніжную ілюстрацыю, скульптуру малых формаў, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Мае ўяўленні аб відах мастацтва, жанрах жывапісу, функцыях архітэктуры і дызайну. Вызначае сродкі мастацкай выразнасці твора, яго вобразы, сюжэты. Ведае некаторыя спецыфічныя аспекты працы мастака (жывапісца, графіка), скульптара, архітэктара, дызайнера, майстра прыкладнога мастацтва.

Малюе прадметы, дэкаратыўныя элементы з натуры, па задуме. Выкарыстоўвае розныя спосабы малявання, тэхнікі працы з новымі маляўнічымі і графічнымі матэрыяламі, сродкі мастацкай выразнасці, розныя колеры, лініі (суцэльная, штрых і інш.), рытм. Валодае элементарнымі графічнымі ўменнямі, неабходнымі для авалодання пісьмом: маляваннем розных ліній і ўмоўных графічных знакаў з 1—3 элементаў у абмежаванай прасторы, штрыхоўкай розных фігур упэўненымі рухамі.

Лепіць прадметы, дэкаратыўныя элементы па задуме, самастойна выбірае сюжэт, стварае кампазіцыю ў залежнасці ад сюжэта. Валодае рознымі спосабамі і прыёмамі лепкі. Выкарыстоўвае сродкі мастацкай выразнасці для стварэння вобраза (аб'ём, форма, дынаміка (жэсты, паставы), дэталізацыя).

Валодае аплікацыяй: прадметнай, сюжэтнай, дэкаратыўнай, плоскаснай, паўаб'ёмнай, з элементамі фларыстыкі. Ведае тэхніку стварэння калажу. Выконвае аплікацыю з розных матэрыялаў (папера, тканіна, прыродны матэрыял). Будуе кампазіцыю. Выкарыстоўвае дэталізацыю.

Канструюе з будаўнічага матэрыялу, дэталяў канструктараў, буйнагабарытных модуляў, прыроднага (непрыдатнага) матэрыялу, паперы (па ўзоры, умовах, задуме, мадэлі). Выкарыстоўвае розныя спосабы канструктыўнай дзейнасці, разнастайныя формы і велічыні, варыянты каляровага вырашэння, фактуры матэрыялу, улічвае ўласцівасці канструктыўнага матэрыялу.

Праяўляе цікавасць да слухання казак, апавяданняў, разглядвання ілюстрацый у кнізе, прагляду спектакляў, эмацыянальна рэагуе на ўспрынятае.

Мае ўяўленні пра літаратурныя творы розных жанраў, можа назваць любімы персанаж.

Выразна чытае невялікі верш, пераказвае самастойна (або па пытаннях) кароткае апавяданне, казку, адказвае на пытанні па іх сюжэце, змесце, аб паводзінах герояў твора.

Складае апавяданне, казку, кароткую гісторыю (па апорнай схеме, апорных словах, па плане, па пачатку), выкарыстоўваючы цацкі або карцінкі.

Самастойна (альбо сумесна з дарослым, пад яго кіраўніцтвам) драматызуе знаёмыя літаратурныя творы або іх эпізоды.

Валодае некаторымі прыёмамі ваджэння лялек (марыянетак, лялек з "жывой рукой", бі-ба-бо, планшэтных лялек, пальчыкавага тэатра, тэатра Пятрушкі і інш.).

Мае вопыт сумеснай мастацкай творчасці (у тэатралізацыі, лялечных спектаклях, падрыхтоўцы і афармленні дэкарацый да іх і да т. п.).

## 5.7. Патрабаванні да якасці дашкольнай адукацыі

Кантроль, самакантроль за забеспячэннем якасці дашкольнай адукацыі выхаванцаў ажыццяўляецца Дэпартаментам кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, упаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі, дашкольнымі ўстановамі на падставе крытэрыяў ацэнкі якасці дашкольнай адукацыі (табліца 2).

*Табліца 2*

**Крытэрыі ацэнкі якасці дашкольнай адукацыі**

| Складнікі якасці дашкольнай адукацыі | Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|---|
| Якасць паслуг дашкольнай установы на рынку адукацыйных паслуг | Прагнастычнасць, рэсурсазабяспечанасць сацыяльна-педагагічнага заказу на адукацыйныя паслугі. Задаволенасць галоўных заказчыкаў | Стан фарміравання сацыяльна-педагагічнага заказу на адукацыйныя паслугі дашкольнай установы: наяўнасць банка даных аб дзецях; аптымальнасць камплектавання дашкольнай установы; узровень фарміравання рэсурсных умоў для забеспячэння якасці рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і паслуг, якія прадстаўляюцца, у адпаведнасці з запытамі. Узровень задаволенасці галоўных заказчыкаў якасцю дашкольнай адукацыі выхаванцаў (ацэнка бацькоў, афіцыйныя вынікі праверак службаў дзяржаўнага кантролю і інш.) |
| Якасць здароўезберагальнай сістэмы ў дашкольнай установе | Здароўезберагальнасць | Адпаведнасць медыка-псіхолага-педагагічнага суправаджэння кожнага выхаванца устаноўленым патрабаванням нарматыўных прававых актаў. Наяўнасць паглыбленых медыцынскіх аглядаў дзяцей. Стан здароўя дзяцей. Аналіз захворвання дзяцей. Вызначэнне аптымальнай вучэбнай нагрузкі на дзіця. Адпаведнасць распарадку жыццядзейнасці дзяцей у дашкольнай установе зацверджаным нормам. Адэкватнасць мер, што прымаюцца па прафілактыцы захворвання. Рацыянальнасць і збалансаванасць харчавання. Узровень узаемадзеяння супрацоўнікаў у гарантаванні бяспечных умоў жыццядзейнасці дзяцей на працягу дня. Размеркаванне абавязкаў, адказнасці супрацоўнікаў у рэалізацыі зместу дашкольнай адукацыі выхаванцаў, арганізацыі адукацыйнага працэсу. Стыль узаемадзеяння з выхаванцамі. Статусная роля бацькоў у забеспячэнні дашкольнай адукацыі іх дзіцяці. Дынаміка стану здароўя за перыяд знаходжання выхаванца ў групе, дашкольнай установе |

| | | |
|---|---|---|
| Якасць адукацыйнага працэсу | Рэалістычнасць зместу дашкольнай адукацыі. Канцэптуальнасць адукацыйнага працэсу. Аснашчанасць адукацыйнага працэсу. Кваліфікаванасць кадраў. Выніковасць адукацыйнага працэсу | Наяўнасць зацверджанага вучэбнага плана ўстановы дашкольнай адукацыі, яго адпаведнасць тыпавому вучэбнаму плану, дыферэнцыраваным адукацыйным паслугам, у тым ліку на платнай аснове, адукацыйным стандартам дашкольнай адукацыі. Адпаведнасць зместу дашкольнай адукацыі, у тым ліку адукацыйных паслуг на платнай аснове, зацверджанай вучэбнай праграме. Адпаведнасць адукацыйных методык, тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца, канцэптуальным палажэнням дашкольнай педагогікі і ўзроставай псіхалогіі. Адпаведнасць аснашчанасці адукацыйнага працэсу вучэбна-метадычнымі комплексамі установленым патрабаванням. Узровень адпаведнасці арганізацыі адукацыйнага працэсу адукацыйнай праграме дашкольнай адукацыі, канцэптуальным палажэнням дашкольнай педагогікі і ўзроставай псіхалогіі: планаванне і арганізацыя адукацыйнага працэсу на аснове педагагічнай дыягностыкі развіцця выхаванца, якую праводзіць выхавальнік ва ўзаемадзеянні з іншымі педагогамі з мэтай аптымальнага выбару педагагічных стратэгій у адпаведнасці з паказчыкамі выхавання, навучання і развіцця, зацверджанымі адукацыйнымі стандартамі дашкольнай адукацыі і вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі. Узровень адпаведнасці развіццёвага прадметнага асяроддзя ўстаноўленым патрабаванням. Дынаміка адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўняў педагагічных і медыцынскіх кадраў (прафесійная кампетэнтнасць), выніковасць метадычнага суправаджэння іх дзейнасці. Узровень адпаведнасці развіцця выпускнікоў дашкольнай установы адукацыйным стандартам дашкольнай адукацыі, якія ацэньваюцца педагогамі выхаванцаў |

| Складнікі якасці дашкольнай адукацыі | Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|---|
| Якасць умоў адукацыйнага працэсу | Адкрытасць дашкольнай установы. Забяспечанасць матэрыяльна-тэхнічнай базы. Фінансаванасць | Узровень адпаведнасці формаў узаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу нормам, устаноўленым заканадаўствам. Адпаведнасць кадравага складу зацверджаным для дашкольных устаноў тыпавым штатам. Наяўнасць вакансій, інтэнсіўнасць руху кадраў. Узровень адпаведнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы дашкольнай установы устаноўленым нарматывам. Выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў па фінансаванні ўтрымання аднаго выхаванца ў год. Фарміраванне і аб'ёмы бюджэтных, пазабюджэтных выдаткаў на год |

## 6. Патрабаванні да арганізацыі выхаваўчай работы

Мэтай выхаваўчай працы з'яўляецца фарміраванне рознабакова развітой, творчай асобы выхаванца, у тым ліку фарміраванне ў яго маральных нормаў.

Выхаваўчая работа накіравана на:

- стварэнне ўмоў для ранняй сацыялізацыі і самаразвіцця асобы выхаванца;
- авалоданне выхаванцамі асновамі здаровага ладу жыцця;
- фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных пачуццяў, маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры.

Напрамкамі выхаваўчай работы з'яўляюцца:

- выхаванне асноў культуры здаровага ладу жыцця;
- маральнае выхаванне;
- патрыятычнае выхаванне;
- эстэтычнае выхаванне;
- працоўнае выхаванне;
- гендэрнае выхаванне;
- экалагічнае выхаванне;
- выхаванне культуры самапазнання і самарэгуляцыі асобы;
- выхаванне культуры бяспечнай жыццядзейнасці;
- сямейнае выхаванне.

Выхаваўчая праца арганізуецца на падставе плана выхаваўчай работы, які з'яўляецца складнікам плана работы дашкольнай установы на адпаведны навучальны год.

## 7. Патрабаванні да рэсурснага забеспячэння адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі

### 7.1. Патрабаванні да кадравага забеспячэння

Асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, якія зацвярджаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Педагагічныя работнікі павінны праходзіць павышэнне кваліфікацыі, у тым ліку ў форме стажыроўкі, не радзей за адзін раз у 5 гадоў.

### 7.2. Патрабаванні да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння

Матэрыяльна-тэхнічная база дашкольнай установы павінна ўключаць:

- памяшканні, кабінеты, пляцоўкі, забяспечаныя мэбляй, інвентаром, сродкамі навучання, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу;
- памяшканні для заняткаў фізічнай культурай;
- іншую маёмасць у адпаведнасці з санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі нарматывамі;
- пераліκі мэблі, інвентара, сродкаў навучання, неабходных для рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, якія зацвярджаюцца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Адказны за выпуск *Д. В. Аўчароў*

Падпісана ў друк 10.06.2013. Фармат 60×90/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. 2. Уч.-изд. л. 1,26. Тыраж 5000. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Пачатковая школа”»
ЛИ № 02330/0494367 ад 16.03.2009.
Вул. Бядулі, 9, 220034, г. Мінск. Тэл./факс 233-99-34.
www.p-shkola.by; e-mail: psh@p-shkola.by

Надрукавана на рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
“Выдавецтва “Беларускі Дом друку”.
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.